РАЗМОВА З ЛАЎРЭАТАМ

# ГАЮЧАЕ СВЯТЛО ДЛЯ ЖЫХАРА ГЛЫБІНКІ

**Духоўнасць, духоўнае адраджэнне... Гэтыя словы апошнім часам сталі часта гучаць у нашым грамадстве. Ці то сапраўды мы ўрэшце схамянуліся, што непапраўна страчваем нешта глыбіннае, ці толькі маніпуліруем словамі, сэнс якіх не заўсёды дакладна разумеем? Напэўна, ёсць сярод нас і тыя, і другія. А нехта аддае перавагу надзённай руплівай працы, да якой хіліцца душа і дзе адчуваеш сябе па-сапраўднаму карысным. Тады і высокае прызнанне, і ганаровая ўзнагарода знаходзяць адрасата самі. Так адбылося з загадчыкам кафедры народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры Рыгорам Фёдаравічам Шаурай. Яму — нашы шчырыя віншаванні з нагоды атрымання прэміі “За духоўнае адраджэнне”.**

— Дзякую. Узнагарода гэтая сапраўды вельмі каштоўная, так што яе вагу, значнасць адразу і не ўсвядоміш. Думаю, падобнае адбываецца з кожным лаўрэатам: здаецца, ніякага подзвігу не здзейсніў, і раптам тваю звыклую штодзённую працу так высока ўшанавалі. Асабіста я адчуваю вялікую адказнасць за атрыманую прэмію, бо патрэбна не проста захаваць яе дэвіз — “За духоўнае адраджэнне”, але і ўмацаваць яго, развіваць далей.

**— Рыгор Фёдаравіч, калі мы ішлі з вамі калідорамі універсітэта, многія спыняліся, віншавалі. Здаецца, ад душы. А як успрыняў калектыў вашу ўзнагароду?**

— Нягледзячы на тое, што ў дыплом упісана маё імя, усе супрацоўнікі кафедры маюць поўнае права віншаваць сёння і сябе. Нашы поспехі і дасягненні — гэта вынік працы высокапрафесійнага калектыву, кіраваць якім для мяне — і шчасце, і гонар.

Дарэчы, па ўводзінах спецыялізацыі “народныя рамёствы” сярод краін былога Саюза менавіта Беларускі універсітэт культуры стаў першапраходцам. Адбылося гэта ў 1990 годзе. Распачынаць справу давялося ў поўным сэнсе “з нуля”: не было ні матэрыяльна-тэхнічнай базы, ні належных памяшканняў, ні выкладчыкаў. Толькі дырэктыва: “увесці спецыялізацыю”... І вось прайшло амаль адзінаццаць гадоў. Аб тым, што зроблена, можна меркаваць, наведаўшы выставы студэнцкіх вырабаў, абарону дыпломных работ, наш музей, ды і проста вучэбныя майстэрні. Сёння іх некалькі: ганчарства і керамікі, ткацтва, габелену, батыка, саломапляцення, малюнка, алейнага і акварэльнага жывапісу. Але творчы чалавек не можа вучыцца толькі ў сценах аўдыторыі, таму наладжваюцца пленэры, вытворчыя і педагагічныя практыкі, экспедыцыі, летнія вандроўкі ў Мір, Нясвіж, Навагрудак, на Браслаўшчыну. Бываюць студэнты і ў майстэрнях вядомых беларускіх мастакоў. Аднак увесь вучэбны працэс трымаецца перш за ўсё на выкладчыках, на іх таленце, высокім майстэрстве і творчай аддачы.

**— Бачу, вы яшчэ і вельмі сціплы чалавек. Атрымалі прэзідэнцкую прэмію і нічога не гаворыце пра сябе.**

— У такіх выпадках прынята пачынаць з біяграфіі? Што ж, заўсёды з цеплынёй узгадваю сваю маленькую радзіму — маляўнічую азёрную Лепельшчыну, дзе і зараз жывуць сваякі. Тут, у вёсцы Малы Полсвіж і ў самім Лепелі, куды хадзіў у школу, праходзіла дзяцінства.

Як ні дзіўна, спачатку вышэйшую адукацыю я пачаў атрымліваць у Віцебскім медыцынскім інстытуце, але вучобу перапыніла армейская служба. А потым ужо і гаворкі не было пра прафесію медыка: яшчэ будучы армейцам, паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута, па заканчэнні выкладаў там нейкі час. Потым была вучоба ў аспірантуры Акадэміі навук Беларусі, у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. У 1993 годзе адкрылася кафедра народных рамёстваў — праз тры гады пасля ўвядзення спецыялізацыі. Тут я і знайшоў найлепшую магчымасць прымянення сваіх сіл і здольнасцяў.

**— Народныя рамёствы бяруць свае вытокі з сельскай глыбінкі, дзе і сёння жыве нямала самародных умельцаў. Нехта перадае сваё майстэрства дзецям і ўнукам, існуюць сямейныя творчыя дынастыі. А ёсць выпадкі, калі тое ці іншае рамяство памірае разам са сваім майстрам. Вы як пераймальнікі лепшых народных традыцый дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва падтрымліваеце пэўную сувязь з народнымі ўмельцамі?**



— Непасрэдны кантакт адбываецца толькі падчас навуковых экспедыцый, а апасродкавана, праз багацце мастацкай спадчыны, мы звязаны самым цесным чынам. Традыцыі народных рамёстваў у вучэбным працэсе выкарыстоўваюцца як падмурак. Наша мэта — развіваць іх да высокапрафесійнага ўзроўню, адшліфоўваць тыя залатыя крупіцы, што маем у спадчыну, да адмысловага майстэрства. Каб тыя ж габелены, ткацкія і ганчарныя вырабы ўспрымаліся не толькі як музейныя экспанаты — жыхары сівой даўніны, а паслужылі на карысць дня сённяшняга.

Безумоўна, творчасць самабытных майстроў з раёнаў і аддаленых вёсачак — гэта частка нашага культурнага і духоўнага скарбу. У апошнія дзесяцігоддзе на іх звярнулі належную ўвагу: сёння ў рэспубліцы адкрыты дамы фальклору, цэнтры рамёстваў, школы народнай творчасці, распрацавана палажэнне аб народным майстры, праводзяцца разнастайныя фестывалі і святы. А ўсё гэта значыць, што годнай справе — жыць, што частку сваёй духоўнай спадчыны мы надзейна захаваем і перададзім нашчадкам.

**— Праваднікамі гэтай годнай справы ў ідэале павінны б стаць вашы выпускнікі. Але рэальнасць паказвае, што на месцах усё трымаецца больш на энтузіязме людзей, якія часта не маюць вышэйшай адукацыі...**

— Так, але наўрад ці справядліва дакараць студэнтаў, што яны не спяшаюцца ехаць у глыбінку. Мы рыхтуем спецыялістаў, у першую чаргу, для раёна, для сяла, але там часта няма ўмоў, каб прыняць іх, замацаваць на месцы. Таму з вялікай ахвотай прымаюцца абітурыенты па мэтавых накіраваннях, па кантрактах — вядома, што гэта будуць запатрабаваныя і ўладкаваныя спецыялісты.

Аднак палітыка нашага ўрада ўсё больш паварочваецца тварам да вёскі і яе працаўніка, і я ўпэўнены, што неўзабаве сітуацыя палепшыцца, — аб гэтым ёсць падставы гаварыць ужо сёння. Горад заўсёды развіваецца па сваіх законах. Яму, шчыра кажучы, нашы выпускнікі не вельмі патрэбныя, больш горад патрэбны ім. А вось сяло зараз, нібы той калодзеж, “высыхае” без прапаведнікаў дабра, прыгажосці, культуры. Я жыву з вераю, што паступова промні гэтага гаючага святла дойдуць да самых глухіх куточкаў Беларусі. Там яны патрэбныя, там іх чакаюць.

**Гутарыла Святлана СЁМКІНА.**

**НА ФОТА:** ***Рыгор Фёдаравіч ШАУРА ў музеі народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры.***

**Фота аўтара.**